# ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

## НАЦЫЯНАЛЬНАЕ МІНУЛАЕ Ў АПОВЕСЦІ ЯНКІ БРЫЛЯ «ЗОЛАК, УБАЧАНЫ ЗДАЛЁК»

**Я. А. Аляксеенка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*Alexeenko_1999@mail.ru;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

У аповесці Янкі Брыля «Золак, убачаны здалёк» ваенныя канфлікты XX ст. (Першая сусветная вайна, Грамадзянская вайна, сутыкненне з Польшчай) знаходзяць імпліцытнае адлюстраванне праз паказ іх уплыву на лёсы дзяцей і жанчын, апавяданні ўдзельнікаў, дэталі пейзажу, пакінутыя рэчы і сведчанні. Пісьменнік звяртаецца да польскай праблемы, аб’ядноўваючы яе з галоўнымі тэмамі беларускай літаратуры мінулага стагоддзя – ваеннай і вясковай, і раскрывае асаблівасці жыцця на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, зыходзячы з уласнага вопыту, што абумоўлівае наяўнасць элементаў аўтабіяграфізму ў творы. Жыхары вёскі Аўсянікі становяцца носьбітамі нацыянальнага характару. На прыкладзе ўспамінаў апавядальніка (Ігара Міхайлавіча) пра дзяцінства і юнацтва Юрыка (наратар дыстанцуецца ад сябе ў мінулым) аўтар раскрывае ўмовы фарміравання светапогляду цэлага пакалення беларусаў, а таксама спецыфіку станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці.

***Ключавыя словы:*** нацыягенез; антываенны пафас; Заходняя Беларусь; вясковая проза; аўтабіяграфізм.

Янка Брыль (*Іван Антонавіч Брыль*, 1917–2006) з’яўляецца адным з самых вядомых і самабытных празаікаў другой паловы XX ст. Яго творчасць, з аднаго боку, універсальная па сваёй сутнасці, таму што транслюе агульначалавечыя і гуманістычныя каштоўнасці. З іншага боку, яна мае глыбінную нацыянальную аснову: Я. Брыль імкнецца раскрыць асаблівасці беларускага народнага характару, адлюстраваць перыпетыі пошуку нацыянальнай ідэнтычнасці на фоне супярэчлівых і трагічных паваротаў гістарычнага працэсу, якія характарызуюць мінулае стагоддзе. Важным фактарам, які паўплываў на фарміраванне светапогляду пісьменніка, становіцца жыццё ў адной з вёсак на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Дзіцячыя і юнацкія гады будучага аўтара праходзяць у беларуска-польскіх рэаліях. Творчасці Я. Брыля уласцівы аўтабіяграфізм: многія падзеі з жыцця пазней пераасэнсоўваюцца аўтарам у мастацкай форме і ператвараюцца ў скразныя матывы. Адным з прыкладаў можна лічыць польскую тэму, якая ўздымаецца ў аповесці «Золак, убачаны здалёк». У творы жыццё ў Заходняй

Беларусі раскрываецца аўтарам у кантэксце фундаментальных для беларускай літаратуры ХХ ст. ваеннай і вясковай тэм.

Аповесць адкрываецца лірычным апісаннем, якое нагадвае класічную пастараль: рака, узлессе, буслянка, новая хата, дзеці – ідылічная, мірная карціна па-за межамі часу і прасторы (хаця бусел, сімвал Беларусі, выконвае сугестыўную функцыю), у якой рэалізуецца міфалагема Раю. Я. Брыль уводзіць апавядальніка-сучасніка Ігара Міхайлавіча. Мужчына з дыстанцыі пражытых гадоў звяртаецца да асэнсавання мінулага, успамінаючы сваё дзяцінства і юнацкія гады ў вёсцы Аўсянікі, якая знаходзілася на мяжы СССР і Польшчы, былой прыфрантавой зоне на лініі Гіндэнбурга. Пры гэтым Юрык, дзіцячае ўвасабленне наратара, і сталага апавядальніка нельга атаясамліваць: яны сімвалізуюць два часавыя пласты і дзве ступені, што вызначаюць спецыфіку кампазіцыйнай арганізацыі аповесці, для якой характэрна выкарыстанне праспекцыі і рэтраспекцыі. Больш за тое, было б памылкай атаясамліваць аўтара і апавядальніка, паколькі, нягледзячы на наяўнасць аўтабіяграфічных паралеляў, апошні належыць мастацкаму свету, створанаму Я. Брылём. У аповесці «Золак, убачаны здалёк» прысутнасць вайны носіць імпліцытны характар. Характэрна, што адгалоскі вайны ў творы падаюцца праз прызму ўспрымання дзяцей, для якіх яна з'яўляецца абстрактным паняццем, запазычаным з апавяданняў дарослых: «…у разуменні і адчуванні мамы і Рамана і ўсіх дарослых людзей, той расейска-нямецкі фронт, тая вайна – была зусім нядаўна. Бо на немцах яна не закончылася: пасля іх была «свабода», потым белапалякі, тады бальшавікі, зноў палякі, якія і ўсталяваліся ў нашых мясцінах са сваімі панскімі парадкамі, якія пасля "свабоды" былі працоўным людзям вельмі не да душы. А мне і Людзе, да якой я прыехаў, усё такое было і недаступна, і цікава толькі па-нашаму, для гульні» [2]. Менавіта такой паслядоўнасцю незразумелых канцэптаў бачыць хлопчык падзеі Першай сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Грамадзянскай вайны, сляды якіх атачаюць героя ў паўсядзённым жыцці. У многіх дамах, якія былі пакінутыя падчас эвакуацыі, захоўваюцца кнігі, часопісы, улёткі, зброя і надпісы на сценах ад невядомых байцоў. Малыя нярэдка аказваюцца ахвярамі выбухаў снарадаў, якія схаваныя ў зямлі прыфрантавой зоны і яшчэ доўга будуць азмрочваць мірнае існаванне жыхароў. Жывымі ўвасабленнямі вайны становяцца самі дзеці: у вёсцы адкрыта абмяркоўваюць адносіны дзяўчат і жанчын з салдатамі розных войскаў, якія праходзілі праз Аўсянікі. Сяброўку героя Тоню называюць Латышкай. Валодзю Казака і Толю Немца,

«іншых», «байструкоў», увесь час высмейваюць, зневажаюць і сутыкаюць адзін з адным, не дазваляючы былой варожасці застацца ў мінулым. Сумныя і лёсы жанчын, на плечы якіх кладзецца цяжар адказнасці за дзяцей і гаспадарку. Многіх вайна зрабіла ўдовамі, а некаторыя сталі ахвярамі гвалту, і гэты траўматычны вопыт наклаў адбітак на ўсё іх астатняе жыццё. Сімвалічнай падаецца фігура Салаўя, некалі перспектыўнага падлетка, ахвяры абставінаў, якога жахі вайны звялі з розуму ў першай жа атацы.

Як можна заўважыць, вобраз беларускай вёскі, створаны Я. Брылем у аповесці, далёкі ад ідэалістычнай карціны быцця. Пісьменнік адмаўляецца ад рамантызацыі вясковай рэчаіснасці, характэрнай для нацыянальнай літаратуры першай паловы стагоддзя. Аднак разам з трагічнымі дэталямі ў творы прысутнічаюць гумар і самаіронія, якія дапамагаюць героям пераадолець траўматычны вопыт і прымірыцца з неідэальнай рэчаіснасцю. Яшчэ адным сродкам зжывання траўмы становіцца акт гаварэння. Вяскоўцы пастаянна вяртаюцца ва ўспамінах да падзей нядаўніх гадоў, перадаючы іх малодшаму пакаленню, каб нашчадкі не дапусцілі іх паўтарэння і захоўвалі памяць пра гісторыю сваёй зямлі. На жаль, апавядальнік, гледзячы ў мінулае з пазіцыі чалавека 70-х гадоў XX стагоддзя, ведае, што пазбегнуць Другой сусветнай вайны не ўдалося. Паказальны эпізод, працяты гуманістычнымі і антываенным пафасам, у якім дзядзька Юрыка распавядае аб першым перамір'і з немцамі пасля трох гадоў вайны і сустрэчы з *Іншым* тварам да твару: «Людзі – як людзі. Каб начальства не гнала – і ён не пайшоў бы. А то ж і абдурваюць нашага брата…» [2]. У Аўсяніках фармуецца так званы ваенны фальклор, прадстаўлены песнямі, прыпеўкамі, анекдотамі, часцяком жорсткімі і грубымі.

Разам з рэцэпцыяй нядаўніх ваенных і рэвалюцыйных падзей разгортваецца барацьба беларускага насельніцтва за захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах падзелу этнічнай тэрыторыі на дзве супрацьстаялыя часткі. Пасля падпісання Брэст-Літоўскага мірнай дамовы тэрытарыяльныя канфлікты не былі вычарпаныя. Польскае кіраўніцтва імкнулася да аднаўлення Рэчы Паспалітай, расейскі бок, у сваю чаргу, спрабаваў вярнуць страчаныя беларускія і ўкраінскія землі, каб правесці саветызацыю ўсходнеславянскага насельніцтва. У выніку беларуская тэрыторыя была рассечаная штучнай мяжой, што не магло не адбіцца на працэсах фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці. Важна адзначыць, што адной з умоў Рыжскага дагавора было абавязковае прадстаўленне этнічным меншасцям культурнай і рэлігійнай свабоды. Аднак на практыцы дзеючая ўлада праводзіла палітыку каланізацыі і паланізацыі былых зя-

мель Расійскай імперыі. У гэтай сітуацыі інструментам прапаганды і прыгнёту становіцца сістэма адукацыі, што знаходзіць адлюстраванне ў аповесці Я. Брыля «Золак, убачаны здалёк». Будучы фактычным грамадзянінам Польшчы, пісьменнік скончыў польскую сямігадовую школу, таму ў раманах, аповесцях і апавяданнях стварае яркія вобразы настаўнікаў-палякаў і раскрывае асаблівасці адукацыйнай палітыкі ў міжваенны перыяд. Агульнавядома, што ў рамках выкаранення беларускай культуры з мэтай выхавання новага пакалення на аснове польскай ідэалогіі ў перыяд з пачатку 1920-х па канец 1930-х гадоў на тэрыторыі Заходняй Беларусі паступова скарачаецца колькасць беларускамоўных школ і настаўнікаў. Пры гэтым інстытут беларускай школы так і не быў створаны на той момант у сілу расійскага ўплыву. Нацыянальная меншасць успрымаецца як группа людзей, якія не маюць ні народнай свядомасці, ні дзяржаўных традыцый. У сітуацыі поліэтнічнасці і палітычнага ціску перад беларусамі стаіць выбар паміж поўнай асіміляцыяй з польскім насельніцтвам і захаваннем нацыянальных каранёў. Для многіх жыхароў «усходніх ускраін», як і для Юрыка, чытанне рускай літаратуры, выкарыстанне рускай мовы і вызнанне праваслаўнай рэлігіі становяцца спосабам процідзеяння прыгнятальнікам і супрацьпастаўлення сябе польскаму насельніцтву. Адсутнасць адзінай дзяржаўнасці і раздробленасць этнасу прыводзяць да замацавання паняцця «тутэйшыя» як формы выказвання ідэнтычнасці. Пры гэтым аўтар голасам наратара кажа аб важнай ролі кантактаў з *Іншымі*, з польскім і рускім бакамі, у фарміраванні гуманістычнага светапогляду і нацыянальнай ідэнтычнасці. Нягледзячы на відавочныя адрозненні, можна вылучыць шэраг універсальных, агульначалавечых каштоўнасцяў, адзіных для ўсіх развітых культур.

Такім чынам, у аповесці Я. Брыля «Золак, убачаны здалёк» ваенныя канфлікты ХХ ст. (Першая сусветная вайна, Грамадзянская вайна, сутыкненне з Польшчай) знаходзяць імпліцытнае адлюстраванне праз паказ іх уплыву на лёсы дзяцей і жанчын, апавяданні ўдзельнікаў, дэталі пейзажу, пакінутыя рэчы і сведчанні. Пісьменнік звяртаецца да польскай праблемы, аб'ядноўваючы яе з галоўнымі тэмамі беларускай літаратуры мінулага стагоддзя – ваеннай і вясковай, і раскрывае асаблівасці жыцця на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, зыходзячы з уласнага вопыту, што абумоўлівае наяўнасць элементаў аўтабіяграфізму ў творы. Жыхары вёскі Аўсянікі становяцца носьбітамі нацыянальнага характару. На прыкладзе ўспамінаў апавядальніка пра дзяцінства і юнацтва Юрыка (наратар дыстанцуецца ад сябе ў мінулым) аўтар раскрывае ўмовы фарміравання светапогляду

цэлага пакалення беларусаў, а таксама спецыфіку станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Альштынюк А.* Праблема аўтабіяграфізму ў творчасці Я. Брыля. Białystok: Uniwersytet w Białymstoku, 2017.
2. *Брыль Я.* Золак, убачаны здалёк. URL: https://knihi.com/Janka_Bryl/Zolak, ubacany zdalok.html (дата звароту: 04. 05. 2022).